# Абмеркаваны перспектывы супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з Курскай вобласцю

Мерапрыемства прайшло сёння ў рэжыме відэаканферэнцыі Мінск-Віцебск-Курск.

Удзел у беларускіх студыях прынялі: кіраўнік беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі, міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Папкоў, гандлёвы прадстаўнік РФ у Рэспубліцы Беларусь Канстанцін Арцюшын, кіраўнік прадстаўніцтва Экспартнага страхавога агенцтва Расіі (ЭСКАР) у Рэспубліцы Беларусь Віктар Даранкевіч, дырэктар міжнароднага развіцця Прадстаўніцтва АТ «Эксар» у Рэспубліцы Беларусь Андрэй Доўнаровіч, старшыня Прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін, прадстаўнік Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыня Віцебскага абласнога саюза наймальнікаў Уладзімір Туравінаў, прадстаўнікі Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага аддзялення БелГПП, шэрагу прадпрыемстваў Віцебскай вобласці. У курскай студыі: намеснік губернатара Курскай вобласці Аляксандр Крывалап, прадстаўнікі адміністрацыі Курскай вобласці і шэрагу прадпрыемстваў.

«Для Курскай вобласці ўзаемадзеянне з Рэспублікай Беларусь з'яўляецца адным з ключавых напрамкаў міжнароднага супрацоўніцтва. Мы імкнемся выбудоўваць надзейныя і доўгатэрміновыя гандлёва-эканамічныя адносіны з беларускімі партнёрамі", - падкрэсліў, адкрываючы мерапрыемства, Аляксандр Крывалап.

Тавараабарот паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю па выніках 2016 года склаў 92 млн дал. ЗША. Асновай экспарту ў Курскую вобласць з'яўляюцца пастаўкі шын, калійных удабрэнняў, нітак комплексных сінтэтычных, пластмасавай тары, вырабаў з чорных металаў і інш. Куране, у сваю чаргу пастаўляюць электрычныя акумулятары, паперу і кардон, пліты, лісты і плёнку з пластмас, стужкі канвеерныя, рамяні прывадныя з вулканізаванай гумы і інш.

На думку старшыні камітэта па развіццю знешніх сувязей Курскай вобласці Віктара Грабеннікава, на сённяшні дзень двухбаковае ўзаемадзеянне прыкметна актывізавалася, і гэта дае надзею на дасягненне росту паказчыкаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў бліжэйшай перспектыве. Гэтаму будзе садзейнічаць работа ў рамках дзеючых пагадненняў з Урадам Рэспублікі Беларусь, з Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамам. Да падпісання рыхтуюцца пагадненне аб супрацоўніцтве з Мінскім гарвыканкамам і Гродзенскім аблвыканкамам.

Гэтую ўпэўненасць падзяліў і кіраўнік беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі Сяргей Папкоў. «Рэспубліка Беларусь разглядае Курскую вобласць як надзейнага і перспектыўнага гандлёва-эканамічнага партнёра, які мае значны патэнцыял для пашырэння і дыверсіфікацыі экспарту беларускай прадукцыі», - выказаў Міністр. Неабходна адзначыць, што па выніках студзеня бягучага года тавараабарот паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю перавысіў 7 млн дал. ЗША - з ростам 143% у адносінах да студзеня мінулага года.

Кіраўнік прадстаўніцтва Эксар ў Рэспубліцы Беларусь Віктар Даранкевіч, які прысутнічаў ў

мінскай студыі, праінфармаваў удзельнікаў нарады аб асноўных стратэгічных напрамках дзейнасці Агенцтва. У прыватнасці, страхавой падтрымцы экспарту тавараў і паслуг расійскай вытворчасці, садзейнічанні выхаду на новыя рынкі, развіцці сучаснай сістэмы фінансавання экспарту, забяспечанага страхавым пакрыццём Агенцтва і тд.

Беларускія прадпрыемствы масава і годна прадстаўляюць сваю прадукцыю на курскай зямлі, у тым ліку і ў рамках Курскага Коренскага кірмашу. Гэта, швейныя і ваўняныя вырабы, мясная і кандытарская прадукцыя, паўфабрыкаты, бытавая хіміі і інш. Сёння атрыманы афіцыйны ліст ад губернатара Курскай вобласці Аляксандра Міхайлава з запрашэннем прыняць удзел у XVII Міжрэгіянальным універсальным аптова-рознічным «Курскім Карэнскім кірмашы» і VI сярэднярускім эканамічным форуме у перыяд з 15 па 18 чэрвеня. І, як запэўніў Сяргей Папкоў і Канстанцін Арцюшын, гэты год не стане выключэннем. Фарміраванне афіцыйнай і бізнес-дэлегацыі пачата ўжо зараз.

*Для даведак:*
*З 2009 года за Міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь замацавана Курская вобласць Расійскай Федэрацыі і ўскладзена персанальная адказнасць за прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у гэтым рэгіёне Расіі і актывізацыю двухбаковых адносін.*
*Міністр сувязі і інфарматызацыі з'яўляецца кіраўніком беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі*

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/23-03-2017-1787*